Алена Бохан

кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў
Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў
(г. Мінск, Беларусь)

# Традыцыі беларускага арнаменту ў сучаснай візуальнай прасторы

Феномен надзвычай актыўнага выкарыстання народнага арнаменту ў фарміраванні сучаснай візуальнай прасторы Беларусі яскрава выявіўся некалькі гадоў таму. Сапраўды, сёння ўжо немагчыма не заўважыць шматлікія цытаванні беларускага арнаменту ў самых розных выпадках. Прытым колькасць «цытат» узрастае з кожным днём. З'ява набыла такія маштабы, што зараз ужо можна вылучыць некалькі характэрных тэндэнцый у выпадках звароту да арнаментальнай спадчыны.



На жаль, сёння мала гаворыцца пра арнамент менавіта як пра мастацкую з'яву, хоць гэта зусім не пярэчыць памкненням разгадаць арнаментальную формулу ці ўспраманню яго як нацыянальнай адметнасці. Калі разглядаць арнамент як сістэму, то неабходна бачыць у ім не толькі сукупнасць нейкіх загадкавых элементаў, але і сукупнасць пэўных колеравых спалучэнняў, пэўных рытмаў. Пластычныя мастацтвы вызначаюцца менавіта ўзаемаадносінамі знакавасці і рэчавасці. Тонкія духоўныя сутнасці візуалізуюцца ў эстэтычнае рэчавае асяроддзе.

Таму асобна можна адзначыць выкарыстанне традыцый беларускай арнаментыкі ў творчасці сучасных мастакоў. Найбольш ярка гэтая тэндэнцыя выявілася ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Пошукі новых пластычных рашэнняў падштурхоўваюць мастакоў да эксперыментаў, у тым ліку, і з выкарыстаннем прыёмаў арнаментальнай будовы. Характэрны арнаментальны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лад і пазнавальныя ўзоры беларускага традыцыйнага арнаменту ў творах Яўгена Адзіночанкі ўспрымаюцца квінтэсенцыяй нацыянальнага пачатку. Лілія Нішчык, якая вызначае напрамак сваёй творчасці як «неаархаіка», засяроджана на пошуках кода да раскрыцця архаічных знакаў арнаменту. У работах Ірыны Радкевіч, якія зусім не паўтараюць канкрэтныя ўзоры, віртуозна адлюстравана сама сутнасць арнаментацыі — гарманізацыя прасторы. Складаны рытм у яе работах выклікае асацыяцыі з бесперапыннай карцінай існавання жыцця.

Аднак, мастацкія творы, якія можна ўбачыць у музеях ці галерэях, наўрад ці магчыма назваць вызначальным фактарам у фарміраванні сучаснай візуальнай прасторы. Найбольш актыўнымі візуальнымі каналамі ўздзеяння на свядомасць сучаснага чалавека з'яўляюцца творы дызайнераў (рэкламная прадукцыя, упакоўка і інш.) і «public art».

Несумненна, што адной з прычын шырокага выкарыстання арнаменту ў сучасных мастацкіх практыках з'яўляецца яго прысутнасць на афіцыйнай дзяржаўнай сімволіцы. Даволі часта арнаментальны фрыз са сцяга паўтараецца на плакатах, прысвечаных дзяржаўным святам, нагляднай агітацыі, упакоўцы тавараў айчыннай вытворчасці і г. д. Зразумела, што візуальная прастора ў такіх выпадках эксплуатуецца ў мэтах правядзення пэўнай ідэалагічнай праграмы. Тут можна назіраць адгалоссе яшчэ савецкіх візуальных практык. Натуральна, што такога роду прадукцыя непазбежна носіць рэгламентаваны характар, але яна, канешне, не павінна быць зусім пазбаўленай творчага падыходу. На жаль, прыёмы ўжывання арнаменту ў большасці такіх выпадкаў з'яўляюцца стэрэатыпнымі. Як даволі няўдалы прыклад механічнага пераносу арнаментальных кампазіцый можна ўзгадаць форму беларускіх алімпійцаў, створаную для XXX Летніх Алімпійскіх гульняў 2012 г. Арнамент у гэтых касцюмах прысутнічае на жакетах, аксесуарах і нават шкарпэтках і насоўках. Асацыяцый з беларускім народным касцюмам, каштоўнасцямі традыцыйнай мастацкай культуры, гэтыя рэчы не выклікаюць. Усё ж такі, арнаментальныя кампазіцыі пажадана ўжываць дарэчна, усведамляючы прыроду сімвала ў традыцыйнай культуры.

Насамрэч, беларускі традыцыйны арнамент — рэч надзвычай «дызайнерская». У аб'ёмных рэчах ён заўсёды падкрэслівае канструктыўныя асаблівасці, на плоскасці стварае лагічныя структуры, напоўненыя сэнсам — канцэптуальныя. Арнамент, увогуле — найлепшае ўвасабленне канцэптуальнага (лацінскае «conceptio»: разуменне, сістэма) мастацтва, у якім надзвычай цесна пераплятаюцца форма і змест. Цяжка знайсці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

штосьці больш канцэптуальнае, чым арнамент, бо гэта пэўны спосаб разумення ці трактоўкі з'яў, прадметаў або працэсаў. Менавіта арнамент з'яўляецца візуальным увасабленнем сістэмы поглядаў у традыцыйным грамадстве, і ён жа ўводзіць арнаментаваную рэч ў сістэму сучаснай культурнай прасторы.

Вышэйсказанае можа тлумачыць яшчэ адну надзвычай важную прычыну звароту да традыцыйнай арнаментыкі — пошукі нацыянальнай ідэнтычнасці ў сучасным грамадстве.

Праблема захавання нацыянальнай адметнасці ва ўмовах глабалізацыі ўвогуле робіцца вельмі важнай у сучасным свеце. Але ў нашай дзяржаве ёсць свая спецыфіка фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці. На жаль, гістарычныя рэаліі не спрыялі таму, каб у сучасным беларускім грамадстве ў падмурках нацыянальнай ідэнтычнасці знаходзілася мова тытульнай нацыі, як гэта адбываецца ў большасці краін свету. Па шэрагу прычын у нашай дзяржаве немагчыма нацыянальная ідэнтычнасць і на падставе рэлігійнай традыцыі. Таму фарміраванне ідэнтычнасці сучасных беларусаў адбываецца ў надзвычай складаных умовах.



Візуальная культура, несумненна, можа ствараць пэўныя характарыстыкі, якія будуць мадыфікаваць мысленне чалавека ў адпаведнасці з пэўнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі. Пры фарміраванні візуальнай прасторы непазбежна паўстаюць пытанні суадносін рэцыпіента, на якога ўздзейнічаюць прадукты мастацкай творчасці, з пэўным культурным асяродкам. І тут вельмі часта на дапамогу прыходзіць арнамент. Магчыма, такі актыўны зварот да выкарыстання арнаментальных «цытат» выкліканы недахопам маўленчых, вербальных вобразаў. І арнамент з'яўляецца, бадай, самым моцным і эфектыўным сродкам невербальнай камунікацыі ў сучасным беларускім грамадстве.

Такім чынам, традыцыйны арнамент становіцца тым, што найлепш можа выявіць ідэю нацыянальнай еднасці беларусаў. Пазнавальныя элементы, характэрны лад кампазіцыі і традыцыйны каларыт арнаменту — усё гэта ў сукупнасці становіцца адзнакай прыналежнасці да беларускага.

Часам здаецца, што выкарыстанне традыцыйнага арнаменту ў рэалізацыі дызайнерскага праекта — апошняя саломінка, за якую хапаюцца для таго, каб хоць неяк вызначыцца з нацыянальнай прыналежнасцю.

Сведчанняў таму, што традыцыйны арнамент усё больш актыўна разглядаецца як адзін з кампанентаў у стварэнні іміджу краіны багата. Асабліва відавочна гэта назіраецца ў брэндзінгу тавараў айчыннай вытворчасці, у афармленні інфармацыйных рэсурсаў, якія прадстаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ляюць афіцыйныя структуры ў інтэрнэце, у рашэнні рэкламнай прадукцыі самых розных дзяржаўных і недзяржаўных праектаў.

Арнамент нават можа выступаць «маркёрам» у вырашэнні праблемы нацыянальнай ідэнтычнасці, якая найперш прадугледжвае атаясамленне сябе з пэўнай культурай. Для фарміравання ідэнтычнасці чалавеку неабходна вызначыць сваю прыналежнасць да «сваіх» і адносіны да «чужых». Інфармацыйная насычанасць арнаментальных кампазіцый дазваляе ў лаканічнай форме перадаць сутнасныя паведамленні, разлічаныя на імгненнае разуменне, напрыклад, прыналежнасці.

Такі свядомы падыход да арнаменту найбольш ярка праяўляецца менавіта ў выбары канкрэтных індывідуумаў. У якасці прыкладу можна прывесці матывы арнаменту, якія абіраюць для татуіровак прадстаўнікі беларускай творчай інтэлігенцыі. У падобных выпадках прысутнічае, натуральна, асабісты адбор арнаментальных матываў, і асабістая канцэпцыя іх увасаблення.

Вытокі гэтай з'явы трэба шукаць у «неапаганскай плыні», якая пачала актыўна развівацца ў 90-я гг. XX ст. Зварот да дахрысціянскай спадчыны можна патлумачыць імкненнем знайсці спрадвечныя, тутэйшыя каштоўнасці. Арнаментальныя ўзоры ў такіх выпадках успрымаюцца таямнічымі знакамі, якія дайшлі да нас праз тоўшчу тысячагоддзяў. Таму часта ў татуіроўках можна назіраць не толькі скампанаваныя элементы, але і асобныя графемы, якія на думку ўладальніка ўзору маюць глыбокае сэнсавае насычэнне, а, магчыма, і магічную моц.

Неабходна акрэсліць яшчэ адну тэндэнцыю, якая досыць яскрава вылучылася ў апошні час. Яе можна ўмоўна пазначыць як імкненне да арнаментальнасці (у гэтым выпадку пад «арнаментальнасцю» разумеецца прага ўпрыгожвання). Сапраўды, адной з прычын выкарыстання арнаменту ў сучасных практыках з'яўляецца сама прырода арнаменту, у якой закладзена імкненне эстэтызаваць візуальную прастору, падкрэсліць канструкцыю прадмета, пазбавіць рэчы аднастайнасці. Часта натуральная патрэба чалавека гарманізаваць акаляючае яго асяроддзе ажыццяўляецца з дапамогай кампазіцыйных прыёмаў, якія спрадвеку выкарыстоўваліся ў традыцыйным мастацтве. Яны вельмі арганічныя для ўспрымання ўсімі, хто хоць бы павярхоўна знаёмы з традыцыйнай культурай беларусаў, і не выклікаюць асаблівых пярэчанняў у самых розных пластах нашага грамадства.

Такім чынам непарыўная сувязь са старажытнымі каранямі прасочваецца ў памкненнях сучасных дызайнераў «акультурыць» візуальную прастору. Прытым, не заўсёды зварот да арнаменту ў такіх выпадках



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

азначае прамое цытаванне традыцыйнага ўзору, перанятага з аўтэнтычнай рэчы. Як, напрыклад, ва ўжо даўно склаўшайся традыцыі беларускіх мастакоў касцюма. Часта можна назіраць хутчэй практыкаванні паводле ўзораў традыцыйнага арнаменту. Такія падыходы найбольш характэрныя для афармлення шыльдаў і вітрын, якія прадстаўляюць тавары мясцовай вытворчасці. Але і ў месцах, здавалася б, вельмі далёкіх па сваім функцыянальным прызначэнні ад месцаў продажу сувенірнай прадукцыі, напрыклад, шапіку, у якім гандлююць рыбай, ці на гарэлачных этыкетках.

На жаль, сэнсаваму насычэнню арнаментальных матываў у такіх выпадках увага не надаецца, маштабы элементаў, колер часта выкарыстоўваюцца адвольна.

Такім чынам, можна адзначыць, што выкарыстанне традыцый беларускай арнаментыкі стала адной з характэрных тэндэнцый у фарміраванні сучаснай візуальнай прасторы. Арнамент валодае надзвычайным патэнцыялам уздзеяння на шырокія колы насельніцтва і багаццем магчымасцей для рэалізацыі разнастайных пластычных рашэнняў. Але плённае развіццё гэтага напрамку магчыма толькі пры ўмовах асаблівай увагі да нацыянальнай культурнай спадчыны.



Валентина Ивченко

кандидат философских наук, доцент,
начальник отдела научно-методического
обеспечения развития профессионального
искусства Института культуры Беларуси
(г. Минск, Беларусь)

# Музей в структуре арт-рынка

Художественная жизнь современного общества многовекторна. Глобализация мирового культурного пространства, новые информационные технологии, доминирование массовой культуры, особенности развития международного арт-рынка, коммерциализация искусства оказали определенное влияние на специфику деятельности музея в обществе и его роль в становлении духовного мира личности и нации в целом. Искусство способно проникать

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ